# Дыплом для Белавежскайпушчы.



РАСПРАЦАВАНЫ ПЛАН КІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПАРКАМ НА БЛІЖЭЙШЫЯ ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ.

Ключавая роля ў плане адводзіцца пашырэнню запаведнай зоны, праектам аднаўлення гідралагічнага рэжыму, парушанага раней праведзенай асушальнай меліярацыяй, у тым ліку на прылеглых тэрыторыях, захаванню пушчы як леса-балотнага комплексу. Планам таксама прадугледжаны меры, скіраваныя наахову і аднаўленне рэдкіх і каштоўных відаў прыродных супольнасцяў.

"План ацэнены міжнароднымі экспертамі на выдатна", — сказала начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля Мінчанка.

Хутка чакаецца пасяджэнне экспертнай групы Савета Еўропы, наякім і плануецца абмеркаваць пытанне аб прадаўжэнні дыплома для Белавежскай пушчы. Дыплом Савета Еўропы — прэстыжная ўзнагарода, якой адзначаюць поспехі нацыянальных паркаў і запаведнікаў па ахове прыроды. Беланежская пушча атрымала дыплом у 1997 годзе за поспехі ў захаванні дзікай прыроды. Галоўнай прычынай прыпынення дзеяння гэтага дакумента стала адсутнасць плана кіравання пушчай на бліжэйшыя 10 гадоў.

Белавежская пушча — адзін з самых старых запаведнікаў у свеце. У 1992 годзе рашэннем ЮНЕСКА Белавежская пушча ўключана ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, у 1993 годзе ёй прысвоены статус біясфернага запаведніка, а ў 1998-м — ключавой арніталагічнай тэрыторыі міжнароднага значэння. Працягласць нацыянальнага парку з поўначы на поўдзень складае больш за 60 кіламетраў, з захаду на ўсход — ад 10 да 50 кіламетраў. Ён займае плошчу 163 505 гектараў, з якіх каля 20 працэнтаў — запаведная зона, дзе забаронена любая дзейнасць чалавека.

***Вольга Бяляўская***

**Источник:** Беларусь.-2010.-№ 3.-С. 56.